назвать надежным партнером сферы белорусского аграрного образования.

**ЛИТЕРАТУРА**

1. Муравицкая, Р. А. Современная модель информационно-библиографического обслуживания сферы аграрного образования / Р. А. Муравицкая, Е. В. Аксюто // Инновационный менеджмент в развитии современной университетской библиотеки: материалы Республиканской научно-практической конференции, посвященной 120-летию со дня рождения Новикова Демьяна Романовича – директора библиотеки академии с 1920 по 1975 гг. / Белорусская государственная сельскохозяйственная академия; редкол.: П. А. Саскевич, Л. И. Кухарева, Г. Е. Медведева. – Горки, 2017. – С. 16-21.
2. Зуева, О. С. Научная статья как фактор повышения узнаваемости и конкурентоспособности вуза / О. С. Зуева, Э. В. Шамсутдинов // Вестник Казанского государственного энергетического университета. – 2017. – № 2 (4). – С. 82-94.
3. Аксюто, Е. В. Информационно-библиографическое обслуживание в Белорусской сельскохозяйственной библиотеке на современном этапе / Е. В. Аксюто, В. Б. Бабарико-Омельченко, Н. С. Шакура // Развитие информатизации и государственной системы научно-технической информации. РИНТИ-2017: XVI Международная конференция, 16 ноября 2017 г., Минск: доклады / Объединенный институт проблем информатики Национальной академии наук Беларуси; науч. ред.: А. В. Тузиков, Р. Б. Григянец, В. Н. Венгеров. – Минск, 2017. – С. 248-251.

УДК 398.91 (476)

## ТЭМА ПРАЦЫ Ў БЕЛАРУСКІХ ПРЫКАЗКАХ

**Асіпчук А. М.**

УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Традыцыйнае ўяўленне пра беларусаў звязана з такой нацыянальнай адметнасцю нашага народа, як працавітасць. Вусная народная творчасць у розных жанрах (казкі, паданні, легенды, быліны, песні і інш.) паказвае працу як аснову існавання чалавека. Асабліва трапна, змястоўна і ў той жа час лаканічна гэта тэма раскрываецца ў беларускай парэміялогіі. Аб’ектам даследавання сталі прыказкі, змешчаныя ў дзвюх кнігах зборніка «Прыказкі і прымаўкі» [1]. У разгледжаных парэміялагічных адзінках умоўна можна вылучыць некалькі асноўных аспектаў, звязаных з працай. Спынімся на іх больш падрабязна.

Спрадвеку ў свядомасці нашых продкаў паняцці «жыццё» і «праца» існавалі ў непарыўнай сувязі: *Усё жывое трудзіцца*; *Дзе быць, там трэба рабіць*; *Не папрацуеш – не пад’ясі* і пад. Праца, як сцвярджае народная мудрасць, гэта і аснова дабрабыту: *Хто працуе, той мае*; *Каб смачна пад’есці і хораша хадзіць, трэба многа рабіць*;



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

*Каму работа služыць, той ні аб чым не тужыць*; *Што чалавек змоладу запрацуе, тое на старасць як знойдзе* і інш.

Любая праца, найперш фізічная, патрабуе вялікага, часам да поту, да мазалёў, высілку: *Шчырая праца – мазалёвая*; *Паносіш мазалёў – пад'ясі хлеба*; *Хто хлеба хоча, той мусе быць у поце*; *Мацей, успацей, калі хлеба захацеў*. І нават для дасягнення самай простай мэты неабходна пастарацца, прыкласці намаганне: *Нічога само не зробіцца*; *Ляжачага хлеба нідзе няма*; *Не пакланіўшыся, і казляка не мецьмеш*; *Арэх не раскусіш – зерня не з'ясі*; *Трэба нахіліцца, каб з ручая напіцца*; *Пячоныя галубы не ўляцяць самі да губы* і інш. Прыведзеныя тут парэміялагічныя адзінкі сваім зместам адпавядаюць добра вядомай рускай прыказцы: *Без труда не вытащишь и рыбку из пруда*.

Шчырая, сумленная праца прыносіць і маральнае задавальненне, узвышае: *Хто не ляніцца, той працай сваей ганарыцца*; *Працуй і смак чуй*; *Горка часам праца, ды хлеб ад яе салодкі*; *Хто працуе, той святкуе*; *Добра працуеш – павагу маеш* і інш. Ды і меркавалі пра чалавека не па яго знешнім выглядзе, а па адносінах да працы: *Не той харош, хто тварам прыгож, а той харош, хто на справу гож*. Больш за тое, праца – вызначальная прыкмета чалавека ў самым высокім, духоўным сэнсе: *Працаваць не любіш – чалавекам не будзеш*. Важным з'яўляецца і этычны момант. Як сцвярджаюць прыказкі, працай, якой бы «чорнай» і цяжкай яна ні была, нельга прынізіць: *Работа не ўстыд*; *Праца нікога не крыўдзіць*; *Праца не паганіць чалавека, а корміць, поіць і вучыць*; *Работа чалавека не ганіць*; *Работа не бясчэсціць чалавека, а крэпіць і цешыць*.

Аднак далёка не кожная праца даспадобы, асабліва калі яна прымусовая: *Прымусовая работа самая цяжкая*; *Працуеш і смаку не чуеш*; *Без ахвоты няма работы* і пад. Зафіксавана шмат парэміялагічных адзінак, у якіх прымусовая праца звязана перш за ўсё з сацыяльнай няроўнасцю людзей. Такая праца не дае прыстойнага заработку, прыніжае чалавечую годнасць, абражае: *Мужык многа працуе, ды нічога не мае*; *Працуеш, працуеш, а пахавацца няма ў чым*; *Багатаму лічыць, а беднаму рабіць*; *Белыя рукі чужую працу любяць*; *Чужая ніўка паядаець сілку*; *Паміраць збірайся, а хлеб пану сей*; *Панам сеюць, жнуць і косяць, а сабе хлеба просяць*; *Рабочы пот лье, а фабрыкант яго кроў п'е* і інш. З горкай ірoніяй паказана ў прыказках і мізэрная аплата (або ўвогуле за «дзякуй») такой працы: *Па капейцы ў дзень: куды хочаш, туды дзень*; *Даюць на кусок хлеба і болей не трэба*; *Што зарабіў, тое і сцерабіў*; *Больш кошка наплача, як ен заробіць*; *Дзякуй не накорміць, не нагрэе* і пад.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Антыпод працаўніка – гультай, збіральны вобраз якога адлюстраваны ў беларускай парэміялогіі надзвычай ярка, дзе са з’едлівым смехам, а дзе і з непрыхаваным абурэннем: *Гультая гані на работу ні холадам, ні молатам, але голадам*; *У гультая свят шмат*; *Гультай – пустому двару гаспадар*; *Дзе работа, там і густа, а ў хаце гультая заўсёды пуста*; *Есці дай, выпіць дай, а аб рабоце не пытай*; *Як да чаркі – скоры, як да працы – хворы*; *Ні да якой работы няма ахвоты*; *Цяжка таму жыць, хто ад работы бяжыць*; *Есць за вала, робіць за камара* і інш. Негатыўнае стаўленне да абібока, да яго нікчэмнага існавання можна прасачыць на такіх сінанімічных прыказках: *Без працы быць – толькі неба капціць*; *Без працы жыць – толькі зямлю цяжыць*; *Абібокам жыць – толькі неба капціць*. Цікава, што гультая нашы продкі параўноўвалі са злодзеем або калекам: *Гультай ды злодзей – два родныя браты*; *Гультай горш калекі*; *Няма горшага калецтва, як гультайства*. З асуджэннем прыкмячалі такую рысу гультая, як балбатлівасць, што перашкаджае працы: *Хто многа гаворыць, той мала робіць*; *Слоў мяшок, а спраў на вяршок*; *Работа з зубамі, а лянота з языком*; *Хто горбам, а хто горлам*; *Ні шавец, ні кравец, ні каваль, ні стругаль – проста гаварыльшчык*. Такім «работнікам» давалі парады: *Больш рабі, а менш гавары*; *Языком сена не накосіш*; *Языком мялі, а справу рабі*; *Не лапачы языком, ды рабі рукамі* і інш.

Уважліва падыходзілі беларусы да працэсу працы і якасці выкананай работы: *Хоць памалу, але добра*; *Добра зрабіць – не ў далоні пляскаць*; *Добра рабі, добра і будзе*; *Лепш мала, ды хораша*; *Рабі так, каб сабак не дражніць і людзей не смяшыць*; *Рабі пільна – і тут будзе Вільня*; *За сто работ бярэцца, а ні адна не ўдаецца*; *Работы многа, а карысці мала*; *Паспех людзям на смех*; *Стук-грук, абы з рук*; *Чым сяк-так, то лепш ніяк*; *Сяк-так наўкасяк, абы не па-людску*; *Абы з рук збыць* і інш. Праўда, залішняя маруднасць таксама не ўхвалялася: *Пакуль адзін бок абстрыжэ, то другі абрасце*; *Пакуль сын абуўся, дык бацька змалаціў*; *Воўк пад акном здохне, калі ён тое зробіць*; *Пораўся-пораўся, а чорта выпараў* і пад.

Важна, як сведчаць прыказкі, любую працу паспець зрабіць у пару, не спазніцца, марна не страціць час: *Кожна работа сваю пару мае*; *Адклад не ідзе ў лад*; *Сягоння зрабі – заўтра як знойдзеш*; *Што зробіш сёння, не трэба будзе рабіць заўтра*; *Адзін дзень варты трох для таго, хто робіць усё ў пару*; *Адзін дзень гайда, а год бяда*; *Хто любіць працаваць, той не будзе доўга спаць*; *Думай з вечара, а рабі з рання*; *Таму рана, каму не дана* і мн. інш.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Намі разгледжаны далёка не ўсе, а толькі найбольш адметныя аспекты тэмы працы ў беларускай парэміялогіі. І тым не менш можна сцвярджаць, што каштоўнасць гэтых прыказак заключаецца ў іх вялікай мудрасці і надзённасці незалежна ад часу стварэння.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Прыказкі і прымаўкі: у дзвюх кнігах / АН БССР, Ін –т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. А. С. Фядосік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1976. – Кн. 1. – 560 с.; кн. 2. – 616 с.

УДК 316.7 161.3(438) (476)

## БЕЛАСТОК І БЕЛАРУСКАЯ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА

**Банцэвіч П. К.**

УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

У апошнія дзесяцігоддзі Беларусь сутыкнулася з праблемай захавання сваіх культурных межаў ва ўмовах выклікаў трэцяга тысячагоддзя, такіх як глабалізацыя сусветнай культурнай прасторы, медыялізацыя культуры, масавая міграцыя, узмацненне тэндэнцый крызісу ідэнтычнасці і сацыякультурнай маргіналізацыі грамадства. У сферы духоўнай культуры набралі моц працэсы, якія патрабуюць распрацоўкі адэкватных стратэгій сацыякультурнага развіцця на аснове паглыбленага навуковага аналізу культурнага вопыту.

Уваходжанне Беларусі ў сусветны гісторыка-культурны працэс прадугледжвае глыбокае асэнсаванне перспектыў развіцця дзяржавы на аснове нацыянальных прыярытэтаў і базавых каштоўнасцей культуры. Неабходнасць на сучасным этапе прааналізаваць свой гістарычны шлях, здабыткі і страты ўласнай культуры, вызначыць найбольш прыдатныя метады і сродкі, якімі можна ўзняць нацыянальную годнасць, патрабуе больш дасканалага вывучэння генезісу, сутнасці і парадыгмаў беларускай культуры, яе развіцця ў сучаснай цывілізацыйнай прасторы. Паўстае праблема высокапрафесійнай інтэрпрэтацыі нацыянальнай культурнай спадчыны на філасофскім, культуралагічным, гістарычным узроўнях і канструявання мадэлі беларускай культуры.

Беласток і Беласточчына цесна звязаныя з беларускім грамадска-палітычным і культурным жыццём. 20 верасня 1944 года паводле пагаднення паміж савецкім і польскім урадамі Беласток з навакольнымі раёнамі быў перададзены Польшчы, у складзе якой было



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ